К17
ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

УДК 413.164 (832)

КАЛЕЧЫЦ АЛЕНА ІВАНАЎНА

# ФАРМІРАВАННЕ І СКЛАД БЕЛАРУСКАЙ ЭНТАМАЛАГІЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

Установа адукацыі

Мінск – 2002

К17
ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Праца выканана на кафедры беларускага мовазнаўства Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук дацэнт Міхайлаў П.А. (БДПУ, кафедра беларускага мовазнаўства)

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук прафесар Булыка А.М. (ІМ НАН Беларусі, аддзел гісторыі беларускай мовы), кандыдат філалагічных навук дацэнт Гваздовіч Г.А. (БДПУ, кафедра сучаснай рускай мовы)

Апаніруючая арганізацыя – Беларускі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца «6» снежня 2002 года ў 16-00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне [illegible] Установе адукацыі «[illegible] імя Максіма Танка» па адрасу: 220050, г.Мінск, вул. Савецкая, 18, тэл. 268-79-27, аўд. [illegible]82.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы 1 лістапада 2002 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый П.А.Міхайлаў

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць даследавання.** Зараз у Рэспубліцы Беларусь праводзіцца рэформа ў галіне навукі і адукацыі і адпаведна змяняюцца праграмы сярэдняй школы, ВНУ і іншых навучальных установ. Гэта патрабуе выдання новых нацыянальных падручнікаў і дапаможнікаў па розных галінах навукі, культуры і тэхнікі. Акрамя таго, адсутнасць некаторых вузкаспецыяльных тэрмінаў стварае перашкоды для выкарыстання беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці энтамолагаў. Менавіта таму асабліва важнай застаецца задача распрацоўкі мікрасістэм спецыяльнай лексікі, паколькі "...у межах вузкіх тэрміналагічных груп прасцей сканструяваць аптымальную паняційную мадэль, якая ўлічвала б усе сістэмныя сувязі і патэнцыяльна магчымыя тэрміны" (Г.А.Цыхун).

Выбар тэмы нашай працы абумоўлены недаследаванасцю беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі, што абмяжоўвае яе ўжыванне ў адпаведнай навуковай галіне. Устанаўленне шляхоў фарміравання, спосабаў утварэння і лексіка-семантычных асаблівасцей адпаведнай тэрміналагічнай лексікі паспрыяе далейшаму развіццю як самой энтамалагічнай падсістэмы, так і ўсёй нацыянальнай тэрміналогіі, дазволіць прыкметна пашырыць межы выкарыстання сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў межах навуковай тэмы «Слова, фразеалагізм, словазлучэнне ў кантэксце» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі 19961536), якая распрацоўваецца на кафедры беларускага мовазнаўства Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» ў 1998–2002 гг.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – вывучыць шляхі і спосабы фарміравання беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі. Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

– скласці на аснове ўсіх беларускамоўных выданняў па заалогіі, апублікаваных у 1918 – 2002 гг., па магчымасці поўны рэестр нацыянальных энтамалагічных найменняў і сістэматызаваць іх;

– прааналізаваць асноўныя спосабы ўтварэння і крыніцы папаўнення беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі;

– даць лексіка-семантычную характарыстыку беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі;

– устанавіць аптымальныя шляхі і спосабы ўпарадкавання прааналізаванай тэрмінасістэмы;

– вызначыць месца энтамалагічнай тэрміналогіі ў агульнай сістэме беларускай нацыянальнай мовы.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца беларуская навуковая тэрміналогія. Прадмет

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

даследавання – 3281 найменне энтамалогіі, якое адлюстроўвае асноўныя этапы фарміравання і асаблівасці развіцця гэтай тэрмінасістэмы.

**Гіпотэза.** Працэс фарміравання і развіцця беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі не закончаны. Ён будзе працягвацца пераважна пад уплывам міжнароднага тэрміналагічнага фонду і папаўняцца лексемамі з дыялектнай мовы.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Метадалагічным прынцыпам даследавання з'яўляецца выснова, што любая галіновая тэрміналогія адносіцца да лексічнай сістэмы літаратурнай мовы і адпаведна падпарадкоўваецца яе законам. Мэта і задачы працы абумовілі выбар апісальнага і параўнальна-супастаўляльнага метадаў, а таксама асобных прыёмаў кампанентнага аналізу і статыстычнага метаду.

**Навуковая навізна і значымасць атрыманых вынікаў.** Навуковая навізна даследавання заключаецца ў тым, што энтамалагічная тэрміналогія ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве з'яўляецца прадметам даследавання. Асноўныя вывады працы будуць садзейнічаць далейшаму развіццю тэарэтычных пытанняў тэрміназнаўства, дазволяць спецыялістам упарадкаваць дадзеную галіновую тэрмінасістэму і заняцца далейшай распрацоўкай спецыяльных найменняў.

**Практычная значымасць атрыманых вынікаў.** Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы курсаў «Сучасная беларуская літаратурная мова» і «Беларуская мова (спецыяльная лексіка)», чытанні спецкурсаў і правядзенні спецсемінараў па разнастайных тэарэтычных праблемах тэрміналогіі на філалагічных і профільных факультэтах ВНУ, пры стварэнні падручнікаў і метадычных дапаможнікаў па заалогіі для школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў і настаўнікаў, пры складанні галіновых тлумачальных і перакладных слоўнікаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Энтамалагічная тэрміналогія з'яўляецца падсістэмай літаратурнай мовы і фарміруецца на яе аснове.

2. У склад дадзенай падсістэмы ўваходзяць як уласнаэнтамалагічныя найменні, так і агульнабіялагічныя тэрміны.

3. Для энтамалагічнай тэрміналогіі характэрны марфалагічны, марфолага-сінтаксічны, лексіка-семантычны, сінтаксічны спосабы ўтварэння і запазычванне.

4. Энтамалагічныя тэрміны адпавядаюць патрабаванням сістэмнасці ў плане зместу і часткова – у плане выражэння, эмацыянальна-экспрэсіўнай нейтральнасці.

5. Прааналізаванай тэрмінасістэме ўласцівы ў пэўнай ступені такія лексіка-семантычныя працэсы, як сінанімія, полісемія і антанімія.

**Асабісты ўклад аўтара.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным аўтарскім даследаваннем, асноўныя палажэнні і вынікі якога грунтуюцца

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

на асабіста сабраным і сістэматызаваным фактычным матэрыяле, з улікам апошніх распрацовак у галіне ўсходнеславянскага тэрміназнаўства.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі выкладзены ў навуковых дакладах на «Чацвёртых навуковых чытаннях, прысвечаных Сцяпану Некрашэвічу» (Гомель, 1999), VIII Міжнародных Карскіх чытаннях «Мова ў святле класічнай спадчыны і сучасных парадыгм» (Гродна, 2000), рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы» (Мазыр, 2001), навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 10-годдзю факультэта беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя Максіма Танка «Сучасныя праблемы беларускай філалогіі і культуры» (Мінск, 2001).

Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні кафедры беларускага мовазнаўства Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» ў 2002 годзе.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыйнага даследавання.** Па тэме дысертацыі апублікавана восем артыкулаў, з якіх 2 – у навуковых выданнях, 4 – у матэрыялах навуковых канферэнцый, 2 – у навукова-метадычных часопісах. Агульны аб'ём – 35 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі даследавання, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (206 найменняў) і спіса ўмоўных абазначэнняў. Акрамя таго, у працы змешчана адна табліца і 28 схем. Агульны аб'ём дысертацыі – 116 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах** вызначаецца актуальнасць даследавання беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі, раскрываецца ступень яе асвятлення ў працах мовазнаўцаў, абгрунтоўваецца класіфікацыя энтамалагічных найменняў на родавідавыя і народавідавыя тэрміны, згодна з якой праводзіцца іх аналіз.

**<u>У першай главе</u> "З гісторыі станаўлення і развіцця беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі"** разглядаюцца агульныя праблемы сучаснага тэрміназнаўства, характарызуюцца асобныя этапы яго фарміравання. Глава складаецца з двух раздзелаў.

**У першым раздзеле** <u>"Актуальныя праблемы беларускай тэрміналогіі"</u> раскрываецца сутнасць паняццяў *тэрміналогія* і *тэрмін*, акрэсліваецца месца спецыяльных слоў у сістэме нацыянальнай мовы, вызначаюцца розныя погляды лінгвістаў на лексіка-семантычныя працэсы і спосабы ўтварэння ў тэрміналогіі. Аналізуюцца прыёмы дэрывацыі гэтых найменняў. Вылучаюцца тэрмінаўтваральныя тыпы, падтыпы, мадэлі і

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

уплываюць семантычныя, марфалагічныя, граматычныя і структурныя адметнасці найменняў, а таксама катэгарыяльнасць тэрмінаў, наяўнасць спецыялізаваных прыкмет, з улікам якіх ажыццяўляецца працэс намінацыі, тыповасць канструкцый і словаўтваральных мадэлей для тэрмінаў аднаго класіфікацыйнага рада. Аналіз тыпаў намінацыі спецыяльных знакаў паказаў, што энтамалагічныя тэрміны ўтвараюцца па матываваных прыкметах, якія аб'ядноўваюцца паводле падабенства. Для пэўнай групы найменняў выкарыстоўваюцца, па магчымасці, аднолькавыя дэрывацыйныя сродкі і тыповыя структурна-граматычныя мадэлі.

**У трэцім раздзеле** "Эмацыянальна-экспрэсіўная характарыстыка энтамалагічнай тэрміналогіі" разглядаюцца спецыяльныя знакі паводле іх экспрэсіўнай нейтральнасці. Падкрэсліваецца, што тыя дэрывацыйныя тэрмінаэлементы, якія з'яўляюцца прадуктыўнымі ў энтамалагічнай тэрміналогіі, часта выкарыстоўваюцца ў агульным ужытку як дадатковыя вобразныя сродкі. Аднак, ужываючыся ў дадзенай мове навукі, яны спецыялізуюцца, або дэсементуюцца: **слон-ік-і, мяккацел-к-і, паўлінавоч-к-і** і інш. Часам сустракаюцца адзінкавыя родавідавыя найменні насякомых, у якіх службовыя тэрмінаэлементы не поўнасцю пазбаўлены памяншальна-ласкальнага значэння: **хрушч** і **хруш-чык-і, бягун** і **бягун-чык**.

**У чацвёртым раздзеле** "Структурна-граматычная характарыстыка энтамалагічнай тэрміналогіі" спецыяльныя найменні аналізуюцца з марфалагічнага пункту погляду. Яны прадстаўлены пераважна назоўнікамі розных тыпаў скланення, ужытых, як правіла, у форме адзіночнага ліку: **рабдом, джала, усмоктванне, малачко** і інш. Аднак большасць састаўных тэрмінаў утвараюцца са спалучэння назоўніка і прыметніка. У склад шматслоўных спецыяльных словазлучэнняў уваходзяць прыметнікі розных разрадаў: якасныя – **насякомыя сапраўдныя, насякомыя ніжэйшыя** і інш.; прыналежныя – **орган грабераў, мальпігіевы судзіны** і пад.; адносныя – **тлушчавае цела, ротавая поласць** і г.д. Яркай адметнасцю энтамалагічнай тэрміналогіі лічыцца ўжыванне назоўнікаў у форме множнага ліку, прычым выкарыстанне гэтай граматычнай катэгорыі ў некаторых выпадках з'яўляецца адзіным адрознівальным сродкам у назвах сямействаў і родаў насякомых. Гэта акалічнасць разглядаецца намі як флексійны тып утварэння тэрмінаў.

**У заключэнні** зроблены наступныя вывады:

1. У фарміраванні і развіцці энтамалагічнай тэрміналогіі выразна акрэсліваюцца два асноўныя этапы – распрацоўка агульнабіялагічных найменняў і стварэнне ўласнаэнтамалагічных тэрмінаў. Іх аналіз дазваляе сцвярджаць, што гэта тэрмінасістэма яшчэ знаходзіцца на стадыі свайго фарміравання і характарызуецца пэўнай неўпарадкаванасцю, у першую чаргу, з лінгвістычнага боку. Адпаведна ў яе склад уваходзяць як уласнаэнтамалагічныя, так і агульнабіялагічныя тэрміны [5, 6].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

2. Энтамалагічная тэрміналогія з'яуляецца падсістэмай літаратурнай мовы і ствараецца на яе аснове. Пра гэта сведчаць аднолькавыя ўмовы іх фарміравання і развіцця, спосабы дэрывацыі, лексіка-семантычныя працэсы [2, 4, 5].

3. Для энтамалагічнай тэрміналогіі характэрны марфалагічны, марфолага-сінтаксічны, лексіка-семантычны, сінтаксічны спосабы ўтварэння і запазычванне. Адметным тыпам дэрывацыі з'яўляецца флексійны, ён уласцівы пераважна найменням катэгорый насякомых. Спецыфічнымі тэрмінаўтваральнымі суфіксоідамі выступаюць фарманты *-крылкі (-крылы), -ножкі, -целкі, -ед,* і *-галава*, якія належаць назвам некаторых таксонаў энтамалогіі. Пры марфолага-сінтаксічным спосабе дэрывацыі выкарыстоўваецца толькі субстантывацыя. Сінтаксічны спосаб утварэння самы прадуктыўны ў энтамалагічнай тэрміналогіі, паколькі большасць сабраных намі моўных адзінак – гэта віды аб'ектаў дадзенай навукі. Паводле структуры ўсе прааналізаваныя спецыяльныя найменні падзяляюцца на простыя і састаўныя. Асноўнымі крыніцамі папаўнення энтамалагічнай тэрміналогіі з'яўляюцца лексічныя і дэрывацыйныя сродкі нацыянальнай мовы, а таксама выкарыстоўваюцца і тэрмінаэлементы з міжнароднага фонду [2, 6, 8].

4. Энтамалагічныя тэрміны адпавядаюць патрабаванням сістэмнасці ў плане зместу і часткова – у плане выражэння, характарызуюцца эмацыянальна-экспрэсіўнай нейтральнасцю [1, 5, 8, 7].

5. Дадзенай тэрміналогіі ўласцівы сінанімія (яна праяўляецца як вынік упарадкавання), полісемія і антанімія, якая мае месца на лексічным і словаўтваральным узроўнях, а таксама выяўлена ў кампанентах састаўных тэрмінаў [1, 3, 4].

## ПУБЛІКАЦЫІ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы

1. Калечыц А.І. З гісторыі станаўлення беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі // Улюбёны ў роднае слова: Навуковае выданне з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння прафесара Ф.М.Янкоўскага / Рэдкал.: П.А.Міхайлаў (навук. рэд.) і інш.– Мінск: БДПУ імя М.Танка, 2000.– С.177–182.

2. Калечыц А.І. Лексіка-семантычны спосаб утварэння тэрміналогіі// Весці БДПУ.– №2(28).– 2001.– С.52–56.

3. Калечыц А.І. З'явы аманіміі і полісеміі ў энтамалагічнай тэрміналогіі // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: Зб. навук. прац дактарантаў, аспірантаў, прысвечаны 80-годдзю БДПУ / Рэдкал.:

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



І.І.Цыркун, А.П.Лабанаў, І.А.Новік і інш.– Мінск: БДПУ імя М.Танка, 2002.– Ч. 2.– С. 16–19.

4. Калечыц А.І. Крыніцы ўзбагачэння і шляхі ўпарадкавання беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі // Актуальныя пытанні беларускай лінгвістыкі (да 80-годдзя прафесара М.С.Яўневіча): Зб. навук. арт. / Рэдкал.: П.А.Міхайлаў, Н.М.Нямковіч і інш.– Мінск: БДПУ імя М.Танка, 2002.– С.82–84.

**Матэрыялы канферэнцый**

5. Калечыц А.І. Некаторыя асаблівасці фарміравання беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі ў 20–30 гады XX ст. // Чацвёртыя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу: Матэрыялы навук. канф.– Гомель: ГДУ імя Ф.Скарыны, 1999.– С.34–39.

6. Калечыц А.І. Утварэнне назваў насякомых лексіка-семантычным спосабам // Мова ў святле класічнай спадчыны і сучасных парадыгм: Тэз. дакл. VIII Міжнар. Карскіх чытанняў, Мінск – Гродна, 14-17 снежня 2000 г. / М-ва адукац. РБ. Бел. дзярж. ун-т, Гродз. дзярж. ун-т імя Я.Купалы.– Гродна, 2000.– С.202–204.

7. Калечыц А.І. Структурна-граматычныя асаблівасці энтамалагічнай тэрміналогіі // Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы: Зб. матэрыялаў рэспуб. навук.-метад. канф., Мазыр, 22-23 сакавіка 2001 г. / М-ва адукац. РБ. Мазыр. дзярж. пед. ін-т імя Н.К.Крупскай.– Мазыр, 2001.– С.44–47.

8. Калечыц А.І. Асаблівасці ўтварэння ныродава-відавых энтамалагічных тэрмінаў сінтаксічным спосабам // Сучасныя праблемы беларускай філалогіі і культуры: Матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 10-годдзю ф-та беларус. філалог. і культ., Мінск, 16 мая 2001 г./ М-ва адук. РБ. Установа адук. “Бел. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка”.– Мінск, 2002.– С.23–26.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЭЗЮМЕ

*Калечыц Алена Іванаўна*

# ФАРМІРАВАННЕ І СКЛАД БЕЛАРУСКАЙ ЭНТАМАЛАГІЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

**Ключавыя словы**: тэрмін, тэрміналогія, родавідавое найменне, няродавідавы тэрмін, спосаб утварэння, тып утварэння, сінанімія, полісемія, аманімія, антанімія, сістэмнасць.

**Аб'ект даследавання** – беларуская навуковая тэрміналогія.

**Прадмет даследавання** – энтамалагічныя тэрміны.

**Мэта даследавання** – вывучыць і прааналізаваць шляхі і спосабы фарміравання беларускай энтамалагічнай тэрміналогіі.

**Метады даследавання**. У працэсе даследавання выкарыстоўваліся апісальны, параўнальна-супастаўляльны і статыстычны метады, а таксама асобныя прыёмы кампанентнага аналізу.

**Навуковая навізна** дысертацыі ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве вывучаецца і манаграфічна апісваецца склад энтамалагічнай тэрміналогіі, даследуюцца этапы яе фарміравання і развіцця, высвятляецца месца гэтай спецыяльнай лексікі ў сістэме нацыянальнай мовы. Прааналізаваны спосабы ўтварэння і крыніцы ўзбагачэння дадзенай тэрмінасістэмы, дадзены рэкамендацыі па ўпарадкаванні і далейшай распрацоўцы энтамалагічных найменняў.

**Практычная значымасць** даследавання заключаецца ў магчымасці выкарыстання яго асноўных вынікаў пры далейшай распрацоўцы актуальных пытанняў сучаснага тэрміназнаўства. Матэрыялы дысертацыі будуць карысныя пры выкладанні курсаў «Сучасная беларуская літаратурная мова» і «Беларуская мова (спецыяльная лексіка)», чытанні спецкурсаў і правядзенні спецсемінараў па разнастайных тэарэтычных праблемах тэрміналогіі на філалагічных і профільных факультэтах ВНУ, пры стварэнні падручнікаў і метадычных дапаможнікаў па заалогіі для школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў і настаўнікаў, пры складанні тлумачальных і перакладных слоўнікаў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**РЕЗЮМЕ**


***Калечиц Елена Ивановна***

**ФОРМИРОВАНИЕ И СОСТАВ БЕЛОРУССКОЙ ЭНТОМОЛОГИЧЕСКОЙ ТЭРМИНОЛОГИИ**

**Ключевые слова:** термин, терминология, родовидовое наименование, неродовидовой термин, способ образования, тип образования, синонимия, полисемия, омонимия, антонимия, системность.

**Объект исследования** – белорусская научная терминология.

**Предмет исследования** – энтомологические термины.

**Цель исследования** – изучить и проанализировать пути и способы формирования белорусской энтомологической терминологии.

**Методы исследования.** В процессе исследования использовались описательный, сравнительно-сопоставительный и статистический методы, а так же отдельные приёмы компонентного анализа.

**Научная новизна** диссертации в том, что впервые в белорусском языкознании изучается и монографически описывается состав энтомологической терминологии, исследуются этапы её формирования и развития, уточняется место этой специальной лексики в системе национального языка. Проанализированы способы образования и источники обогащения этой терминосистемы, даны рекомендации по упорядочению и дальнейшей разработке энтомологических наименований.

**Практическая значимость** исследования заключается в возможности использования его основных результатов при дальнейшей разработке актуальных вопросов современного терминоведения. Материалы диссертации будут полезными при преподавании курсов “Современный белорусский язык” и “Белорусский язык (специальная лексика)”, чтении спецкурсов и проведении спецсеминаров по различным теоретическим проблемам терминологии на филологических и профильных факультетах ВУЗов, при написании учебников и методических пособий по зоологии для школьников, абитуриентов, студентов и учителей, при создании толковых и переводных словарей.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY

*Kalechyts Alena Ivanauna*

### FORMATION AND STRUCTURE BYELORUSSIAN ENTOMOLOGICAL TERMINOLOGY

**Key words**: the term, the terminology, the gender aspect name, the un gender aspect term, the way of formation, the type of formation, synonymy, polysemy, homonymy, antonymy, systemy.

**Object of research** – Belarusian scientific terminology.

**Subject of research** –the entomological terms.

**The purpose of research** is to study and analyse the ways and manners methods of the formation of Belarusian entomological terminology.

**Methods of research.** During the research both the descriptive and statistical methods as well as separate method of component analysis used.

**The scientific novelty** of the dissertation is that the structure of the entomological terminology, the stages of its formation and development are studied, monographic described and investigated, the place of this special lexicon in the system of the national language is specified for the first in time in the Belarusian linguistics. The methods of the formation of this terminosystem and the sources of us enrichment are analysed, the recommendations for ordering and further development of entomological names are given.

**The practical importance** of research lies in the possibility of use of the basic results by the further development of actual questions of the modern study of terms. The materials of the dissertation will be useful at teaching courses «The modern Belarusian language» and «The Belarusian language (special lexicon)», reading of special courses and realization of special seminars on various theoretical problems of the terminology at philological and profile faculties of higher educational establishments, in the making of textbooks and methodical grants on zoology for the schoolboys, entrants, students and teachers, at creation of the explanatory and translation dictionaries.